# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА
# А. В. МІХАЙЛОЎСКАЙ – Р. М. ГІРО

**Перыяд дзеяння:**

снежань 1941 г. – кастрычнік 1943 г.

**Месца дзеяння:**

в. Лётцы

**Колькасць:**

14 чалавек

**Кіраўнікі:**

Міхайлоўская А. В. («Оля»), Гіро Р. М. («Іван Іванавіч»)

Група А. В. Міхайлоўскай, потым Р. М. Гіро налічвала 14 чалавек і вяла работу ў в. Лётцы са снежня 1941 г. да кастрычніка 1943 г. Група складалася пераважна з настаўнікаў і вучняў мясцовых школ. У яе ўваходзілі: жонка Гіро Ефрасіння Андрэеўна, Р. С. Тумановіч, А. С. Скуратава (Быхаленка), М. Г. і Г. К. Быкавы, Г. Ф. Гусакова, І. Ф. Макавецкая, Л. С. Быкаў («Пецька»), Г. А. Мацецкая (Залатарова), Л. С. Скуратава (Жызнеўская).

Пристанцыйная в. Лётцы размяшчалася каля чыгункі Віцебск – Полацк, па якой гітлераўцы забяспечвалі групу армій «Цэнтр». У задачу падпольшчыкаў уваходзіла назіранне за рухам па чыгунцы і шашы, за гарнізонамі, якія былі размешчаны на шляху ад Віцебска да Шуміліна. Група назірала за домам адпачынку «Лётцы», дзе базіраваліся штабы нямецкіх вайсковых часцей і знаходзіліся на адпачынку розныя спецпадраздзяленні, трымала ў полі зроку варожы аэрадром каля в. Княжыца. Падпольшчыкі склалі план Лётцаў, на якім былі пазначаны ўмацаванні, агнявыя кропкі, штабы і інш. З мая 1942 г. разведінфармацыя ад падпольшчыкаў стала паступаць у Віцебскія падпольныя райкамы КП(б)Б і ЛКСМБ. Сувязь з групай армейскай разведкі Ю. С. Рудакова ажыццяўлялася праз Л. Скуратаву, Р. Тумановіч, Л. С. Быкава.

У чэрвені група перададзена разведгрупе М. Р. Яфімава («Армейца»).

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група П. К. Ляхоўскага і А. В. Міхайлоўскай – Р. М. Гіро / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 491–492.

2. **Подпольная** группа Ляховского П. К. и Михайловской Е. В. – Гиро Р. М. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 291.